# Служба 101 заўсёды на сувязі

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Але ж не будзем ківаць толькі на ўкраінцаў — крытыкаваць іх было б справядліва, калі б у першую чаргу нашы грамадзяне выконвалі ўсе правілы бяспечных паводзін у лесе. А гэта далёка не так. Праязджаеш па лясных сцежках, асабліва пасля выхадных, і бачыш, што шмат дзе раскідана смецце. А лес можа загарэцца нават ад шкляной бутэлькі, калі яна спрацуе як лінза... Агулам жа на экасістэмах ад пачатку года адбылося больш за 7 тысяч пажараў. Але ў нашу статыстыку трапляюць толькі тыя ўзгаранні, якія мы дапамагалі тушыць лясгасу.

**«Патрэбна нейкае прынцыповае рашэнне па забеспячэнні праезду пажарнай і іншай спецтэхнікі ў двары шматпавярховай забудовы».**

***— Дзесьці напрыканцы мінулага года я чуў, што за выхад на слабы лёд будзе ўведзены штраф ці нейкая іншая адказнасць. Чаго ж баяцца?***

— Трэба баяцца выходзіць на тонкі лёд. Такія меры мы прапануем, каб хоць нейкім чынам зменшыць людскія страты. Псіхалогія многіх людзей такая, што на страты ўласнага кашалька яны рэагуюць куды лепш, чым на папярэджанні і вербальныя ўшчуванні. Але, больш за тое, людзей, якія самахоць пайшлі на тонкі лёд і праваліліся, даводзіцца ратаваць і пасля лячыць за кошт бюджэту... Можна, вядома, паставіць засцерагальныя шыльды, аднак ці ўсе людзі звяртаюць на іх увагу? І таму прапанова штрафу — гэта не сродак зарабіць грошай, а мера, скіраваная перш за ўсё на бяспеку саміх людзей, што выходзяць на лёд.

***— Механізм працы нам бачыцца наступным. Мясцовыя органы ўлады будуць мець магчымасць на мясцовым узроўні абвяшчаць забарону на выхад на лёд у залежнасці ад яго таўшчыні і трываласці.***

— Праблема ёсць яшчэ ў тым, што ўпаўнаважаных людзей, якія могуць збіраць штрафы, малавата. Па асобных напрамках іх колькасць трэба павялічваць, у тым ліку і датычна вады. Напрыклад, за купанне ў забароненых месцах прыцягваюць да адказнасці толькі супрацоўнікі органаў унутраных спраў. А ў Таварыства ратавання на водах такой функцыі няма.

**— Ці плануецца павялічваць адказнасць за выпальванне травы?**

— Не. Давайце прааналізуем гэтую сітуацыю. Пажар травы — гэта з'ява другасная. Перш за ўсё, увагу трэба звяртаць на тое, што можа гарэць. Я маю на ўвазе засмечанасць тэрыторый. І спярша змагацца трэба менавіта з ёй. Прадстаўнікі органаў улады, ЖКГ, Міністэрства ўнутраных спраў маюць права складаць пратаколы на ўласнікаў засмечаных тэрыторый. Разам з тым весці размову аб павелічэнні штрафаў пакуль не час. Можа, іх і малавата, трэба было б больш. Але выкарыстоўваць гэты складнік пакуль можна. Ды і ўплываць на падпальшчыкаў можна і іншымі сродкамі. Напрыклад, тлумачыць ім, што калі агонь нанясе значны ўрон, то наступіць адказнасць крымінальная. А гэта ўжо сур'ёзней, чым проста заплаціць штраф.

**— Ігар Валковіч, Ліда. У апошні час у Беларусі назіраецца масавая адмова ад праваднога радыё. Пры гэтым некалькі гадоў таму супрацоўнікі МНС заяўлялі, што «нічога больш эфектыўнага і надзейнага, чым праваднога радыё, для давядзення інфармацыі да насельніцтва па каналах грамадзянскай абароны пакуль не прыдумана». Скажыце, калі ласка, ці бачыць МНС паўнавартасную альтэрнатыву праваднога радыё? Можа быць, варта было б захоўваць існуючыя камунікацыі ў інтарэсах грамадзянскай абароны?**

— Праваднoe радыё заўжды лічылася адным з надзейных сродкаў інфармавання. Але абарваўся провад — і як пачуць паведамленне? Ды і, сказаць па праўдзе, ці заўжды ў вас дома ўключаны правадны радыёпрыёмнік? Таму апошнія 5-7 гадоў мы паўсюль расказваем, як гучыць сірэна на вуліцы і што рабіць, калі вас заспеў гэты гук. Альтэрнатыва ж праваднога радыё ёсць. Гэта перахоп FM-вяшчання. Выбраны гэты дыяпазон таму, што ён ёсць на ўсіх сучасных радыёпрыёмніках, у тым ліку ўманціраваных у тэлефоны. 99% працэнтаў тэрыторыі краіны ахоплена гэтай магчымасцю. На тэлебачанні мы можам размяшчаць бягучы радок. Ды і на самі мабільныя тэлефоны можна даволі хутка даслаць паведамленні. Праблемы з гэтым у гарадах няма. Плюс не забудземся пра нашы спецсродкі гучнай сувязі, сувязь ДАІ, іншых службаў, у якіх ёсць аўтамабілі.

**— У Мінску з-за шчыльнай забудовы і павальнай аўтамабілізацыі насельніцтва ратаўнікі не заўжды могуць зручна падабрацца да месца ўзгарання. Год ад года сітуацыя толькі пагаршаецца. Раскажыце, што плануецца зрабіць для таго, каб выйсці з гэтага становішча?**

— Гэтае пытанне ўжо падымалася на шматлікіх узроўнях. А ўсё адбылося з-за таго, што своечасова не прадумалі яго, не чакалі, што ў нас магчыма кратнае павелічэнне асабістага аўтатранспарту. Раней жа было як? Калі планавалі будаўніцтва жылога дома, праектавалася пляцоўка для стаянкі аўтамабіляў, зыходзячы з таго, што 1 жалезны конь будзе на 4 кватэры. А сёння ў многіх сем'ях па дзве машыны. І вось куды іх падзець? Паркінгі і стаянкі шмат дзе далёка не поўныя. І тут ужо ролю адыгрывае менталітэт — машыну купіць нядорага, а за паркоўку заплаціць — гэта грошы ўжо непад'ёмныя. І вось як нам заехаць у двор, калі перашкаджае транспартны сродак, і выратаваць чалавека? А калі праз абы-як пастаўленае аўто мы, крый Божа, спознімся? Усім жа хочацца паставіць машыну ў крокавай даступнасці. А так, на жаль, у вялікім горадзе быць не можа. Калі толькі не павялічваць плошчу стаянак у дварах — а з іншага боку пры такім рашэнні зменшыцца плошча зялёных насаджэнняў. Шмат пустуе месцаў і ў гаражах. І знесці іх нельга, і машыны там не паркуюцца.



Фота БЕЛТА.

**«Прапанова штрафу — гэта не сродак зарабіць грошай, а мера, скіраваная перш за ўсё на бяспеку саміх людзей, што выходзяць на лёд».**

— За мяжой праблема вырашаецца прасцей. У Японіі, напрыклад, аўто рэгіструецца толькі пасля прад'яўлення будучым кіроўцам пасведчання аб паркоўцы. Яшчэ многія кіроўцы любяць паставіць машыну абы-як, тлумачачы гэта тым, што яны зрабілі так «на хвілінку». Зусім побач ад нас Прыбалтыка, дзе нікога не будзе цікавіць — на хвілінку ці на гадзінку вадзіцель прыпаркаваўся не па правілах. Ён тут жа атрымае істотны штраф. А ўзгадайце дыскусіі, якія разгортваліся ў сеціве падчас абмеркавання законапраекта аб канфіскацыі аўтамабіляў у п'яных кіроўцаў, калі іх лавілі другі раз на працягу года. Нягледзячы на ўсё, гэты закон быў прыняты. І што бачым? Колькасць нецвярозых за рулём паступова пачала скарачацца. Таму патрэбна нейкае прынцыповае рашэнне па забеспячэнні праезду пажарнай і іншай спецтэхнікі ў двары шматпавярховай забудовы. Падабаецца гэта камусьці або не, але тут гаворка ідзе ўжо пра чалавечыя жыцці.

**— Турбуюць з Брэста. Ці прымаюць падраздзяленні Міністэрства па надзвычайных сітуацыях сапсаваныя люмінісцэнтныя лямпы? Ведаю, што дзе-нідзе такая практыка існавала. Цяпер жа ў інтэрнэце інфармацыя розная наконт яе...**

— У Брэсце іх прымае, напрыклад, электралямпавы завод. У розных рэгіёнах розныя рашэнні гэтага пытання, але вы заўсёды можаце патэлефанаваць па нумары 101 і ўдакладніць, куды іх можна прынесці. Мы можам зрабіць выключэнне толькі тады, калі ў вас лямпа сур'ёзна пашкоджана. Трэба адпаведным ведамствам ствараць больш пунктаў прыёму не толькі ў вялікіх гарадах, бо выходзіць так, што МНС — нешта накшталт панацэі ад усіх няшчасцяў. А так быць не павінна.

**— Вас турбуе Алена з Барысава. Я не разумею, чаму за ліквідацыю асіных гнёздаў неабходна плаціць грошы?**

— Таму што джаланосныя насякомыя будуюць свае гнёзды некалькі месяцаў. Яны не з'яўляюцца вокамгненна. А гаспадар мусіць сачыць за станам свайго жытла і іншых пабудоў. І атрымліваецца, што яго хібу павінны бясплатна выпраўляць ратаўнікі. Хаця што перашкаджала рэгулярна аглядваць куткі і гарышчы? Гэта ўсё роўна што ў лес не хадзіць (там жа таксама восы і шэршні жывуць), а выклікаць МНС на апрацоўку. Мы арганізацыя бюджэтная, і для яе вызначаны канкрэтны спіс функцый. Там, дзе ёсць рэальная пагроза, мы аказваем садзейнічанне бясплатна. Напрыклад, гэта дзіцячыя садкі, школы, дамы сацыяльнага забеспячэння.

**— Сёлета ў краіне рэкордна нізкая колькасць загінулых на пажарах. Як удалося дамагчыся такой лічбы?**

— Яшчэ старажытныя людзі казалі: у корані асноўных няшчасцяў, якія з намі здараюцца, ляжыць бесклапотнасць. А вось пра яе наступствы мы і тлумачым з дапамогай разнастайных формаў і метадаў уздзеяння. Разгарнулі шырокую прапаганду, наглядную рэкламу, задзейнічаем рэсурс сродкаў масавай інфармацыі. Ідзём на сельскія сходы, у школы, у дзіцячыя садкі. Але працуем мы не ў адзіночку. Нам дапамагаюць Таварыства ратавання на водах, міліцыянеры, Дзяржаўтаінспекцыя, дзіцячы пакой міліцыі, святары, кіраўніцтва мясцовых выканаўчых органаў... Вось нядаўна падпісалі пагадненне з БРСМ, дадзім моладзі неабходныя веды. І такая масіраваная агітацыя спрацоўвае! Вось не адна жанчына кажа: еду на працу і бачу шчыт, на якім выява праса, што палае. Пачынае прыгадваць, ці выключыла яна з разеткі ўсе электрапрыборы. Тэлефануе на працу, адпрошваецца на гадзіну-паўтары. Прыходзіць дадому і пераконваецца, што ўсё выключана.

Вось некалькі гадоў таму пыталіся: а навошта нам столькі рэкламы, прысвечанай бяспечнай жыццядзейнасці? Але ж паглядзіце на іншыя краіны, там яе не менш. І задарма грошы ніхто выкідваць не будзе. Асабліва калі гаворка ідзе пра жыцці людзей. Некалькі гадоў таму мы звярталіся ў інфармацыйна-аналітычны цэнтр пры Адміністрацыі Прэзідэнта для таго, каб зразумець, якія формы агітацыі лепш ужываць у розных соцыумах. Атрымалася, што для вясковых жыхароў больш падыходзяць кантактныя формы — сельскія сходы, асабістыя сустрэчы. У гарадах, дзе рытм жыцця больш шпаркі, лепш ужываць шчыты, бягучыя радкі, рэкламу на грамадскім транспарце. Мы ж хочам дастукацца да кожнага бацькі і нават дзіцяці. Вось, напрыклад, 20 гадоў назад гінула больш за 100 дзяцей на пажарах. А пазалетась гэтая лічба скарацілася ў пяць разоў!

**— Раскажыце, калі ласка, пра групу рызыкі падрабязней.**

— У яе ўваходзяць старыя, адзінокія пенсіянеры і сем'і з малалетнімі дзецьмі, а таксама п'яніцы і курцы. Асабліва мы заклапочаны гібеллю пенсіянераў. Вядуць некаторыя з іх сябе ўжо не вельмі адэкватна, не ва ўсіх застаецца матывацыя да жыцця. Забыўся грэлку выключыць, запалку кінуў, не пагасіў пліту. А вось у Сярэдняй Азіі, на Каўказе, у паўднёвых краінах старых людзей гіне прыкметна менш. Гэта звязана з традыцыйным грамадствам: жанчыны там, як правіла, не працуюць, іх клопат — дзеці, дом і старыя. Наколькі гэта магчыма ў нас — пытанне. Яшчэ ў якасці прыкладу можна разгледзець ЗША. У 1980-я гады колькасць загінулых пенсіянераў складала 16%, цяпер дасягае 29%.

**«Мы можам зрабіць выключэнне толькі тады, калі ў вас лямпа сур'ёзна пашкоджана».**

**— Алег Віктаравіч тэлефануе, горад Лагойск. У мяне дома праблемы з печчу. Да каго трэба звяртацца па тое, каб яе адрамантавалі або склалі новую? Наколькі я чуў, спецыялізаваныя ліцэнзіі ў печнікоў адмянілі яшчэ некалькі гадоў таму.**

— Так, гэтая інфармацыя правільная. Для таго, як правільна класці печ, існуюць спецыяльныя патрабаванні. Можна, вядома, папрасіць адрамантаваць народнага ўмельца, але я б рэкамендаваў звярнуцца ў спецыялізаваную арганізацыю ЖКГ, якая працуе ў кожным раёне. Яна дае гарантыю і нясе адказнасць за сваю працу. І яшчэ дам некалькі парад па доглядзе печы. Правярайце адсутнасць шчылін, у тым ліку і на дымаходзе. Зазірніце на гарышча, паглядзіце, які стан коміна там. Пабяліце печ. Калі вы дзесьці ўбачыце сляды курадыму — значыць, там утварылася шчыліна.

**— Турбуе Сяргей Бендаж з вёскі Праўцюкі Мазырскага раёна. За 800-900 метраў ад нашай вёскі размешчаны палігон цвёрдых бытавых адходаў. На ім пастаянна самаўзгараецца смецце. Каля пяці гадоў таму быў моцны пажар, які перайшоў на лес і за 100 метраў ад жылых дамоў быў ліквідаваны сіламі МНС. У ліпені быў моцны пажар, які перайшоў на лес. Верхавы пажар за 200-300 метраў да першых жылых дамоў быў спынены сіламі МНС. Калі ж гэта скончыцца?**

— Праблема ёсць, узялі яе на кантроль.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

## Азбука бяспекі

### АСЯДЛАЎ МАТАЦЫКЛ — НАДЗЕНЬ ШЛЕМ!

**Сталічная Дзяржаўтаінспекцыя ўзмоцніць кантроль за кіроўцамі мотатранспарту.**

— Рэйды па выяўленні парушэнняў Правіл дарожнага руху інспектары будуць праводзіць як у дзённы, так і ў начны час сутак, — паведаміла **кіраўнік прэс-службы ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Таццяна ХАРЛІНСКАЯ.** — З пачатку года ў сталіцы з удзелам двухколавых транспартных сродкаў адбылося 18 дарожна-транспартных здарэнняў, у якіх два чалавекі загінулі, 18 атрымалі раненні рознай ступені цяжкасці. Асноўнымі прычынамі дарожнага траўматызму і смяротнасці можна назваць парушэнне правіл манеўравання, праезд на чырвоны сігнал святлафора, няправільны выбар хуткасці руху. Чым вышэй хуткасць, тым менш шанцаў зрэагаваць на перашкоду, якая ўзнікае на дарозе. Часта можна гаварыць і пра недастатковы вопыт кіравання гэтым відам транспарту. Нямала ДТЗ з матацыклістамі адбылося і па віне кіроўцаў аўтамабіляў, таму ўважлівымі патрэбна быць усім удзельнікам дарожнага руху.

**ТРЭБА ВЕДАЦЬ**

*Дзяржаўтаінспекцыя нагадвае, што кіраваць матацыклам неабходна ў шлеме. Апроч таго, шлем павінен быць і на пасажыры. Для прыцягнення да сябе ўвагі на дарозе байкерам рэкамендуецца рухацца з пастаянна ўключаным бліжнім святлом фар. Таксама ўладальнікам мотатэхнікі неабходна паклапаціцца пра своечасовую рэгістрацыю транспартных сродкаў і праходжанне тэхагляду.*

**Сяргей РАСОЛЬКА**




### КАБ ПОЛЫМЯ НЕ ЗАВІТАЛА Ў ШКОЛУ

**Падрыхтоўку школ да чарговага навучальнага года емагчыма ўявіць без супрацьпажарнага рэйду. І гэта дае плён — калі ў 2003 годзе тушыць пажары ў школах даводзілася ажно 14 разоў, то сёлета такая дапамога спатрэбілася ўсяго аднойчы...**

— Практычны вопыт паказвае, што кантроль за станам пажарнай бяспекі неабходна ўзмацніць, як і саму сістэму падрыхтоўкі адказных за яе, — лічыць **першы намеснік начальніка ўпраўлення нагляду і прафілактыкі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Уладзімір СУВОРАЎ.** — Толькі сёлета за яе неналежны стан да адміністрацыйнай адказнасці мы прыцягнулі 1156 кіраўнікоў і 236 адказных асоб. Парушэнні ўжо даўно сталі звыклымі: сапсаваліся тэхнічныя сродкі супрацьпажарнай абароны, замкнуты дзверы на шляху эвакуацыі, загрувашчаны мэбляй праходы...

Разам з тым парушэнняў, з-за якіх трэба было б прыпыніць працу школ, інспектары не выявілі. Пры гэтым асаблівa пільная ўвага надавалася ўстановам адукацыі, размешчаным у глыбінцы. Нават дагэтуль 54 школы ацяпляюцца ўзімку печкамі...

— Аналіз пажараў, якія адбыліся ў школах за апошнія 13 гадоў, паказвае, што больш за 80% з іх адбылося з-за чалавечага фактару, — сцвярджае Уладзімір Сувораў. — А каб яго папярэдзіць, шмат сродкаў не патрабуецца, дастаткова толькі выконваць існуючыя правілы бяспекі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## Ну і ну!

### ГОСЦЮ ЧАКАЎ РАСПАЛЕНЫ ПРАС...

**Праваахоўнікі з Савецкага РУУС сталіцы затрымалі мужчыну, які спрабаваў вярнуць свае грашовыя сродкі ў стылі «ліхіх 90-х» пры дапамозе... распаленага праса.**

— У дзяжурную часць Першамайскага райаддзела міліцыі пазваніла жанчына, якая сцвярджала, што яе дачка вярнулася дадому са слядамі апёкаў на целе. На пытанне маці пра іх паходжанне апошняя распавяла, што была ў гасцях у знаёмага, які пражывае па вуліцы Мірашнічэнкі, — паведаміла «Звяздзе» **прэс-афіцэр Савецкага РУУС г. Мінска Аляксандра ПАПОВА.** — Дык вось той мужчына западозрыў госцю ў крадзяжы грошай з кватэры. І паспрабаваў вярнуць іх пры дапамозе распаленага праса. «Негасцінны» гаспадар затрыманы. Заведзена крымінальная справа па артыкуле «Катаванне», які прадугледжвае пакаранне ў выглядзе арышту на тэрмін да трох месяцаў ці абмежавання волі тэрмінам да трох гадоў або пазбаўлення волі на той жа тэрмін.

**Сяргей РАСОЛЬКА**


**Бобруйское управление филиала «Центр «Белтехинвентаризация» ОКАЗЫВАЕТ УСЛУГИ ПО:**
- оценке имущества (недвижимость, транспорт, оборудование)
- организации и проведению аукционных торгов
- инвентаризации и оценке зеленых насаждений

**ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 17 сентября 2015 г. в 11.30 состоятся открытые аукционные торги по продаже имущества, обращенного в доход государства, в составе Лота № 1 (предмет торгов):**

| | |
|---|---|
| **Наименование и адрес предмета торгов (Лот № 1):** | **Изолированное помещение с инвентарным номером 710/D-15120 (квартира № 313) общ. пл. 111,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Максима Горького, д. 41** |
| **Организатор торгов** | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509 (220034, г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска, МФО 153001369) |
| **Место проведения торгов и подачи документов** | г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 в здании Бобруйского управления филиала «Центр «Белтехинвентаризация» |
| **Начальная цена продажи** | 961 634 200 рублей, размер задатка – 10%, что составляет 96 163 420 рублей |
| **Номер расчетного счета для перечисления задатка** | Получатель платежа – Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска, код 153001369 |
| **Характеристика текущего состояния предмета торгов** | Квартира находится в кирпичном многоквартирном доме с электроснабжением, централизованным отоплением, газоснабжением, холодным и горячим водоснабжением, канализацией, год постр. – 1983. Кол-во комн. – 3, этаж расположения 9-10, площадь кухни (столовой) – 37,1 кв.м, санузел совм., высота потолков – 2,47, в стадии ремонта. В квартире перепланировка не оформлена в установленном законодательством порядке. До перепланировки общая площадь квартиры составляла 99,6 кв.м, кол. комн. – 4 |
| **Условия продажи** | Проведение победителем аукционных торгов работ по восстановлению перепланировки и переустройства в части изоляции отапливаемого помещения квартиры от летнего помещения лоджии и переноса сетей отопления |
| **Срок и условия оплаты за приобретенное с торгов имущество** | В течение 80 календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов на счет Организатора торгов разовым платежом либо траншами |
| **Срок подачи документов, осмотра предмета торгов и внесения задатка** | по 11 сентября 2015 г. включительно до 16.00 |

**Порядок проведения торгов**: Шаг аукциона определяется в размере от 5 до 15 процентов от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. По завершении торгов составляется протокол об итогах проведения торгов, который подписывается победителем и членами аукционной комиссии. В случае, если заявка на участие в торгах подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Задаток, внесенный Победителем торгов (Претендентом на покупку) будет зачтен в счет окончательной стоимости приобретенного имущества, остальным участникам будет возмещен в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. **В случае, если заявка на участие в торгах подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов**. Организатор торгов (по письменному указанию соответствующей комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства) вправе снять предмет торгов с торгов в любое время до объявления его проданным.

**Победитель (Претендент на покупку**) возмещает затраты на организацию и проведение торгов не позднее 3 рабочих дней со дня проведения торгов в соответствии с соглашением о правах и обязанностях сторон.

****Более подробная информация об условиях участия в торгах, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, опубликована в газете «Звязда» от 15 июля 2015 г.**

**Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 72 01 32, 72 13 93, 8 (044) 710-50-85 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 30 сентября 2015 года повторных торгов по продаже конфискованного имущества**

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение, продаваемого имущества)** | - капитальное строение с инвентарным номером 614/С-25044, площадью 229,4 кв. м (наименование: садовый домик; назначение: садовый домик), расположенное по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, садоводческое товарищество «Орешники»; - земельный участок с кадастровым номером 624883000020000062, площадью 0,0640 га (назначение: земельный участок для коллективного садоводства), расположенный по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, садоводческое товарищество «Орешники»; - земельный участок с кадастровым номером 624883000020000063, площадью 0,0488 га (назначение: земельный участок для коллективного садоводства), расположенный по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, садоводческое товарищество «Орешники» |
| **Начальная цена** | 358 270 400 белорусский рублей |
| **Сумма задатка** | 35 800 000 белорусских рублей |
| **Организатор аукциона** | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, (017) 327-40-22 |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

**Аукцион проводится 30 сентября 2015 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 10.09.2015 по 28.09.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 – УП «Минский городской центр недвижимости».**

**ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 29 сентября 2015 г. повторных торгов по продаже конфискованного имущества**

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества)** | Незавершенное незаконсервированное капитальное строение (жилой дом с постройками), расположенное на земельном участке №625082302601000016 по адресу: Минская область, Солигорский район, Краснодворецкий сельский совет, аг. Краснодворцы, пер. Садовый-1, д. 8 (площадь земельного участка 0,2492 га) |
| **Начальная цена** | 370 710 000 рублей |
| **Сумма задатка** | 37 000 000 рублей |
| **Организатор аукциона** | УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 10 |

**Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

*Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Для участия в аукционе по нескольким предметам торгов необходимо внести задаток в размере, установленном для предмета торгов с наибольшей начальной ценой. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов.*

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

**Аукцион проводится 29 сентября 2015 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 07.09.2015 по 25.09.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 – УП «Минский городской центр недвижимости».**

**ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 28 сентября 2015 г. повторных торгов по продаже имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней**

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества)** | Капитальное строение (здание картофелехранилища 1975 года постройки, кирпичное одноэтажное, после реконструкции 2008 года общей площадью 3638 кв.м инвентарный номер в ЕГРНИ 644/С-38132), назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ |
| **Сведения о земельном участке** | Здание расположено на земельном участке 625000000012001704 площадью 2,3832 га |
| **Местонахождение имущества** | Минская обл., Солигорский р-н, ст. Калий-1 |
| **Начальная цена** | 8 835 382 800 рублей |
| **Сумма задатка** | 883 000 000 рублей |
| **Организатор аукциона** | УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 10 |
| **Балансодержатель (должник)** | Коммунальное торговое унитарное предприятие «Солигорский горплодовощторг», г. Солигорск, ул. Северная, 6 |

**Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

*Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Для участия в аукционе по нескольким предметам торгов необходимо внести задаток в размере, установленном для предмета торгов с наибольшей начальной ценой. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов.*

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

**Аукцион проводится 28 сентября 2015 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 07.09.2015 по 24.09.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 – УП «Минский городской центр недвижимости».**